**Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Каралінская сярэдняя школа”**

# Брашура “ Вядомыя асобы ў гісторыі малой радзімы”

## Уводзіны

Пошукавы атрад “Вытокі” ДУА “Каралінская сярэдняя школа” прааналізаваў, сістэматызаваў матэрыял да брашуры “Вядомыя асобы ў гісторыі малой радзімы”.

Асабліва наша Зэльвеншчына славіцца паэтамі. Гэта: Ларыса Геніюш, Алена Таболіч, Данута Дабрыніна, Юрка Голуб, Ірына Войтка, Уладзімір Мазго, Алена Кароза.

Ёсць у нас і вядомыя вучоныя – Антон Жэбрак, Міхаіл Іоська, Сяргей Сідар.

У нас у школе працаваў заслужаны настаўнік БССР – Георгій Сцяпанавіч Лабовіч, а вучыўся заслужаны трэнер БССР па гандболу – Леанід Пятровіч Ган.

На Зэльвеншчыне нарадзіліся Заслужаны артыст БССР Сяўко Баляслаў Іванавіч і дзяржаўны дзеяч Малочка Мікалай Пятровіч, а таксама жыў Герой Савецкага Саюза Павел Ільіч Жданаў.

**Алена Ўладзіміраўна Таболіч** нарадзілася ў вёсцы Горна на Зэльвеншчыне. Вучылася ў Зэльвенскай сярэдняй школе. Закончыла Мінскі дзяржаўны універсітэт, дзе і працавала выкладчыкам на факультэце англійскай мовы. Кандыдат філалагічных навук, дацэнт, вывучала праблемы параўнальнай лінгвістыкі. З вершамі і перакладамі англійскіх і амерыканскіх паэтаў выступае ў перыядычным друку. Апошнія выдадзены асобнай кнігай "Срэбны дождж" (1999 г.). У кнігу ўключаны вершы дваццаці дзевяці англійскіх і амерыканскіх паэтаў. Вершы падаюцца не толькі ў перакладзе, але і ў арыгіналах. І тут застаецца здзіўляцца, што "кволая" жанчына зрабіла замах на такіх волатаў, як Уільям Шэкспір, Генры Лангфэла, Роберт Бёрнс, Джон Кітс, і спіс можна доўжыць.

Адна з аўтараў-складальнікаў "Англа-беларуска-рускага слоўніка" (1995 г.).

Упершыню з творчасцю Алены Таболіч чытачы "Працы" пазнаёміліся напачатку 1995 года, калі ў "Зорах над Зальвянкай" быў надрукаваны ў яе перакладзе на беларускую мову верш Роберта Бёрнса "Прыгожы званочак".

Алена Уладзіміраўна – таленавіты даследчык творчасці англамоўных паэтаў і перакладчык іх твораў на беларускую мову.

Свае пераклады з англамоўнай паэзіі Алена Таболіч сціпла называе "аматарскімі". Дарэчы, і паэткай сябе не лічыць, а хутчэй "настальгічнай асобай", у якой размова з краем свайго маленства – старажытнай Зэльвеншчынай адбываецца праз паэтычныя пераклады.

Галоўнае ў яе вершах і перакладах – жывая плынь пачуцця і шматколерная палітра роднай мовы.

Алена Уладзіміраўна ведае некалькі замежных моў, але найпрыгажэйшай лічыць беларускую, бо як выдатны мовазнаўца тонка адчувае ўсю яе прыгажосць і непаўтарнасць.

Усім сэрцам яна любіць сваю "малую Радзіму", вёсачку Горна, дзе часта адпачывае і працуе. Яе хвалюе ўсё. Што адбываецца дома: экалогія, культура, дабрабыт вяскоўцаў, прырода – горненскія квяцістыя лугі, задумленыя пагоркі, светлае раздолле палёў.

**Данута Васільеўна Дабрыніна** (Чыргун) нарадзілася ў 1940 годзе ў в.Горна. Закончыла СШ №1 г.п. Зэльва, затым вучылася ў Магілёўскім педагагічным інстытуце на філалагічным факультэце.

Пасля заканчэння інстытута настаўнічала ў школах Зэльвенскага і Ваўкавыскага раёнаў, затым напружаная праца ў метадычным кабінеце РАНА, а затым больш як 25 гадоў Данута Васільеўна працавала ў Гомельскім абласным інстытуце ўдасканалення настаўнікаў, у тым ліку 21 год – намеснікам дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце. У 1997 годзе ёй прысвоена вучонае званне дацэнта за навукова-метадычную дзейнасць.

Д.В. Дабрыніна – аўтар больш за 50 навукова – метадычных публікацый, двух праблемных дапаможнікаў па ўдасканаленню сістэмы павышэння кваліфікацыі педагагічных кадраў, крытэрыяў ацэнкі дзейнасці пазашкольных устаноў.

За значны ўклад у развіццё сістэмы павышэння кваліфікацыі педагагічных кадраў Д.В. Дабрыніна ў 1996 годзе ўзнагароджана Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. А ў маі 2000 года – медалём Міністэрства адукацыі РБ і Акадэміі паслядыпломнай адукацыі "За заслугі. Сістэма павышэння кваліфікацыі."

Данута Васільеўна Дабрыніна пачала пісаць вершы з дзяцінства, пісала на беларускай і рускай мовах.

На рубяжы двух стагоддзяў, у 1999 годзе, выйшаў у свет яе першы паэтычны зборнік "Васільковае поле" – гэта яшчэ адзін яе жыццёвы рубеж.

"Васільковае поле" – як першы паэтычны зборнік, у які ўключаны лірычныя вершы і паэма, якая дала яму назву. Гэта верш пра чысціню кахання, пра сувязь думак і пачуццяў паэткі з прыродай роднага краю, таленавітасцю яго людзей, іх жыццёвымі радасцямі і нягодамі.

Кожны радок "Васільковага поля" прасякнуты шчырай, зычлівай павагай паэткі да роднай Зэльвеншчыны і яе працаўнікоў, асабліва да гарнян-аднавяскоўцаў – жыццялюбаў і аптымістаў.

Паэтка ўлюблённая ў родную вёску Горна, дзе яна нарадзілася, дзе прайшлі яе дзіцячыя гады.

Данута Васільеўна аддана любіла сваю Зэльвеншчыну. І дзе б ні была, у думках "з усіх шляхоў да хаты бацькавай спяшаецца…", у вёсачку, якая "спрадвек гадуе песняроў-пэтаў, што ўслаўляюць хараство яе перад светам".

Вершы напісаныя ёю. Простыя, яскравыя, сонечеыя і лёгкія. Яны падкупляюць чысцінёй пачуццяў.

Паэткай кіруе яе сэрца, - маладое, узнёсла – рамантычнае. У паэзіі Дануты Дабрынінай хапае і таленту, і жыццёвай мудрасці, і грамадзянскасці.

Усяго паэтка выдала 5 зборнікаў вершаў.

**Ірына Антонаўна Войтка ( Ган)** нарадзілася ў в.Каралін 23 кастрычніка 1961 года. Маці працавала паляводам, а бацька – каваль. У 1979 годзе закончыла Каралінскую сярэднюю школу, а ў 1984 – філалагічны факультэт БДУ.

Пасля заканчэння універсітэта наша зямлячка выкладала родную мову ў Цяглевіцкай сярэдняй школе.

Пасля пераезду сям'і Войтка ў г.Слонім, Ірына Антонаўна працавала выхавальніцай дзіцячага садка №11. Пры гэтым садку паэтка стварыла музей нарднай творчасці і побыту беларусаў. Затым да 2020 года працавала загадчыцай дзіцячага садка №3. Пад кіраўніцтвам паэткі створана студыя беларускай культуры "Святліца".

Вершы пачала пісаць яшчэ ў школе. Першы верш называўся "Сінія вочы". У 2003 годзе ў Слонімскай друкарні выйшаў першы зборнік паэткі "Спасціжэнне". У 2010 – пабачыла свет другая кніжка Ірыны Антонаўны – "Пагляжу вачамі неба". Кожны паэтычны твор паэткі наталяе душу, як песня, як малітва, ахінае любоўю, светлай і бязмежнай, на якую здольна яе добрае сэрца і якую так шчыра, удумліва і ўзнёсла яна нясе людзям. У яе вершах выразна і шчыра гучыць тэма любові да роднай Беларусі, да яе прыгожых куточкаў і гарадоў, да непаўторных каляровых краявідаў, якія так радуюць трапяткую і далікатную душу паэткі.

У 2010 годзе Ірыну Антонаўну прынялі ў саюз пісьменікаў Беларусі.

Родная мова для паэткі – найвялікшы скарб. Ірына Антонаўна закахана ў роднае слова, у такую мілагучную і прыгожую родную мову. Яна просіць землякоў шанаваць і бласлаўляць роднае слова.

Многія вершы нашай зямлячкі пакладзены на музыку, напрыклад такія як "Не суцяшай мяне ад болю", "О, роднае слова". Іх вобразнасць, лірызм і жыццёвасць прываблліваюць чытачоў.

Жывымі радкамі твораў яна выказвае свой існы чалавечы абавязак перад святымі творцамі, надзяляе сваёй душэўнай цеплынёй і пяшчотаю падзяку маці, прашчурам за падараванае жыццё і "снуе слова роднага тонкую ніць" для сваёй Бацькаўшчыны.

**Ларыса Антонаўна Генію́ш (Міклашэвіч (1910 - 1983)** нарадзілася 9 кастрычніка 1910 года ў маёнтку Жлобаўцы Гродзенскага павета ( цяпер Ваўкавыскі раён). У 1928 годзе скончыла Ваўкавыскую польскую гімназію.

З 1937 г. жыла ў Празе, дзе прымала ўдзел у дзейнасці беларускай эміграцыі (была сакратаром урада БНР). У 1949 г. прыгаворана да 25 гадоў зняволення ў папраўча-працоўных лагерах. Пакаранне адбывала ў Комі АССР. Вызвалена ў 1956 г. Пасялілася ў Зэльве, дзе жыла, не прыняўшы савецкага грамадзянства. Памерла 7 красавіка 1983 года.

Друкавалася з 1939 г. у эмігранцкіх выданнях. Выйшлі зборнікі паэзіі "Ад родных ніў" (Прага, 1942), "Невадам з Нёмана" (1967), " На чабары настоена" (1982), "Белы сон" (1990), кніжкі для дзяцей "Казкі для Міхаські" (1972), "Добрай раніцы, Алесь" (1976), кнігі ўспамінаў "Споведзь" (1993). Пра жыццё і творчасць Л. Геніюш зняты дакументальны фільм "Вянок цярновы васількоў", мастацкі фільм "Птушкі без гнёздаў".

У вершах Ларысы Геніюш так многа таго, што бззваротна адышло ў мінулае, але гэта вершы будкчыні.Яны ачышчаюць наіўным шчырым духам нашых продкаў. Галоўная вартасць гэтых вершаў – іх беларуская шчырая праўда. Пра што б ні ткалася – пра тое, як у пушчы збірае шчырыя грыбы, ці пра тое, як сапраўды шукала свайго месца сярод адданых змагароў у Заходняй Беларусі.

Нашу неабсяжную Радзіму Ларыса Геніюш бачыла прыгожай, мудрай, мірнай у шчыльным злучэнні яе даўнасці, яе багатай гісторыі з працавітай сучаснасцю і бясхмарнай бясконцасцю. Шчырасць, гасціннасць беларусаў паэтка вылучае як самую адметную рысу.

Сейбітка глыбокіх думак,ткаля наватарскіх метафар і перыфраз на аснове народных традыцый, умее дакапацца и да грунтовых плыняў гісторыі, умее высока ўзляцець на крыллі песні, несучы насустрач усім праявам жыцця нерастрачанае пачуццё любові да роднай зямлі "ў задуманых злёгку дзявочых вачах", - такі паэт Ларыса Геніюш.

**Юрый Уладзіміравіч (Юрка Голуб ) (1947 -2020)** нарадзіўся 20 кастрычніка 1947 года ў вёсцы Горна, у сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Горненскай пачатковай школы, вучыўся ў Зэльвенскай сярэдняй школе. У 1970 годзе закончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працаваў рэдактарам на Гродзенскай студыі тэлебачання, загадчыкам аддзела культуры абласной газеты "Гродзенская праўда". У 1979 годзе ўзначаліў аддзел мастацкага вяшчання Гродзенскага абласнога тэлебачыння і радыё. Быў вядучым тэлепраграмы "Гродзеншчына літаратурная".

У 1963 годзе Юрый Уладзіміравіч пачаў друкавацца ў раённай газеце "Праца". Праз два гады яго вершы пабачылі свет на старонках рэспубліканскіх выданняў. Юрка Голуб з'яўляецца аўтарам зборнікаў паэзіі "Гром га зялёнае голле", "Дрэва навальніцы", "Векапомнае поле", "Помню пра цябе", "Сын небасхілу","Поруч з дажджом" і інш. Ён аўтар кніг для дзяцей "У бары грыбы бяры" і "Птушыны радавод". Ён тварыў з адметным почыркам і ладам, выступаў не толькі як паэт, але і як празаік, і перакладчык.

З 1971 года – член Саюза пісьменнікаў СССР. 10 гадоў узначальваў Гродзенскую абласную арганізацыю Саюза беларускіх пісьменнікаў. Лаўрэат літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова.

Юрый Уладзіміравіч вельмі любіў сваю малую радзіму, лаканічна і ўзнёсла праслаўляў яе ў сваіх вершах і прозе. У сваіх магутных вершах паэт заставаўся верным сваім вытокам – непаўторнай Бацькаўшчыне, глыбінным карэнням чалавечай душы, усяму, што створана людскім розумам і рукамі.

**Мазго Уладзімір Мінавіч** нарадзіўся 5 сакавіка 1959 года ў г.п. Зэльва. Беларускі паэт. У 1985 г. скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Працаваў карэспандэнтам шматтыражнай газеты, выхавальнікам, супрацоўнікам рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання. З 1984 г. рэдактар выдавецтваў "Юнацтва", "Мастацкая літаратура". Аўтар зборнікаў вершаў "Пад спеў крыніц" (1982), "Вершаліна" (1987), "Марафон" (1992) і кніжак для дзяцей "калі спрачаюцца маланкі" (1989), "Суседзі па сусвеце" (1994). Многія вершы пакладзены на музыку.

**Алена Станіславаўна Кароза (Жамойціна)** нарадзілася ў 1951 годзе ў в.Каралін у дружнай і працавітай сям'і. Скончыўшы ў 1966 годзе 8 класаў Каралінскай школы, Алена паспяхова вытрымала "шалёны" конкурс у Ваўкавыскае педагагічнае вучылішча. У 1970 годзе закончыла яго на выдатна і на ўсё жыццё "засталася выкліканай да дошкі…"

У 1979 годзе Алена Станіславаўна завочна закончыла гістарычны факультэт БДУ.

Працавала наша зямлячка ў Славаціцкай, Міжэрыцкай, Зэльвенскай санаторнай школах. Пачынаючы з 1976 года і аж да выхаду на пенсію ў 1998 годзе, Алена Станіславаўна працавала настаўніцай пачатковых класаў Зэльвенскай СШ №2.

Вельмі цікавым і напружаным для настаўніцы стаў 1992 год. Наша зямлячка выйшла ў суперфінал рэспубліканскага конкурсу "Настаўнік года".

За добрасумленную працу ў выхаванні падрастаючага пакалення Алена Станіславаўна ўзнагароджана двума знакамі "Выдатнік Народнай Асветы" (1984 г.; 1992 г.), двумя граматамі Міністэрства адукацыі, трымя – абласнога выканаўчага Камітэта, шмат грамат раённага аддзела адукацыі. Імя нашай зямлячкі занесена ў кнігу Славы нашага раёна.

А яшчэ Алена Станіславаўна піша прыгожыя мілагучныя вершы. У 2006 годзе выйшаў яе бібліятэчны зборнік "Складаемыя шчасця", а таксама ёсць яе вершы ў зборніку "Зоры над Зальвянкай". Друкуе свае вершы наша зямлячка ў газетах "Праца", "Народны доктар", "Зоры над Друццю", "Літаратура і мастацтва". Алена Станіславаўна лічыць, што слова – гэта божы дар, нейкае незямное натхненне ад зямнога жыцця-быцця. Таму яе вершы – гэта рэакцыя, водгук яе ўнутранага голасу на рэаліі чалавечага жыцця, чалавечых адносін, чалавечых пачуццяў. А натхняе на іх напісанне ўсё тое, што яе акружае: беларуская прырода, сябры, родныя, вучні, настаўнікі. Ведае амаль напамяць "Новую зямлю" Я. Коласа і "Курган" Я. Купалы.

Алена Станіславаўна ніколі не адмаўляе людзям, а заўсёды гатова прыйсці на дапамогу. Усё жыццё яна карыстаецца мудрасцю: "Помніць павінен той, каму далі ці дапамаглі. І ніколі не павінен напамінаць аб гэтым той, хто даў ці дапамог".

**Леанід Пятровіч Ган** нарадзіўся 10 чэрвеня 1937 года ў сям'і патомнага кузняца .
У 1952 годзе закончыў сем класаў Івашкавіцкай сямігодкі, затым год вучыўся ў Зэльвенскай школе. З 1953 па 1965 – студэнт фізкультурнага тэхнікума г. Гродна.

У тэхнікуме Леанід Пятровіч захапіўся баскетболам, і ў далейшым гэта стала яго спецыялізацыяй. Настаўнікам яго быў вядомы беларускі трэнер Анатоль Марцінкевіч. У час вучобы наш зямляк выступаў за зборную вобласці па баскетболу спартыўнага аб'яднання "Ураджай".

З 1956 па 1959 гады служыў наш зямляк у арміі ў Прыкарпацкай ваеннай акрузе. Вось там і захапіўся гандболам: у воінскай часці было шмат прыхільнікаў гэтай гульні.

Пасля службы Леанід Пятровіч вярнуўся на радзіму і пайшоў працаваць настаўнікам фізічнай культуры ў Зэльвенскую сярэднюю школу. Завочна вучыўся ў інстытуце фізічнай культуры ў г. Мінску. З 1967 года па 1997 працаваў трэнерам спартыўнай школы, затым будучы ўжо на пенсіі працаваў яшчэ 9 гадоў на гэтай пасадзе.

54 гады працы наш зямляк аддаў трэнерскай рабоце, з раніцы і да позняга вечара займаўся з дзецьмі, якія ў выніку станавіліся выдатнымі гандбалістамі.

За выдатную падрыхтоўку спартсменаў Леанід Пятровіч неаднаразова адзначаўся абласнымі і рэспубліканскімі Ганаровымі граматамі, у 1980 годзе атрымаў званне Заслужанага трэнера Беларусі, стаў суддзёю рэспубліканскай катэгорыі. На працягу 17 гадоў трэніраваў зборную каманду вобласці па гандболу.

Наш зямляк адчувае вялікі гонар за сваіх выхаванцаў – спартсменаў, якія праславілі нашу краіну на высокім міжнародным узроўні. 20 выхаванцаў звязалі сваё жыццё са спортам і сталі паспяховымі трэнерамі. Сярод іх – Уладзімір Міхута (трэнер гандбольнага клуба ў г.Наваполацку), Валерый Цівунчык (трэнер гандбольгага клуба ў Партугаліі). Барыс Рэпкін (трэнер гандбольгага клуба ў Мінску) і іншыя.

Леанід Пятровіч - таленавіты педагог, мэтанакіраваны і моцны чалавек, цікавы суразмоўца, ён праз усё жыццё пранёс любоў да сваёй справы.

**Антон Раманавіч Жэбрак (1901-1965)** нарадзіўся 27 снежня 1901 года ў невялікай вёсцы Збляны ў незаможнай сялянскай сям'і. Вучыцца пачаў у царкоўна- прыходскім вучылішчы, якое знаходзілася ў суседняй вёсцы Лаўрыновічы. Затым юнак паступіў у Слонімскае пачатковае вучылішча, якое не змог закончыць з-за пачаўшайся Першай сусветнай вайны.

У 1915 годзе сям'я вымушана пераехаць у г. Мыцішчы – прыгарад Масквы, а затым у г.Шацк ( Разанская вобл.). Тут, у 1917 годзе Антон Жэбрак заканчвае рэальнае вучылішча, уступае ў камсамол, а ў 1918 годзе – у РСДПР (б).

У 1921 годзе ён паступіў на агранамічны факультэт Маскоўскай сельскагаспадарчай акадэміі імя Ціміразева, якую выдатна скончыў у 1925 годзе па спецыяльнасці генетыкі. Акадэмія, а пазней і Інстытут чырвонай прафесуры далі будучаму вучонаму фундаментальныя веды, паклалі пачатак фарміраванню яго навуковых прынцыпаў і светапогляду.

У1929 годзе Жэбрак прызначаны дацэнтам кафедры генетыкі і селекцыі раслін Ціміразеўскай акадэміі.

На працягу 1930-1931 гадоў стажыраваўся ў Калумбійскім універсітэце (ЗША) ў знакамітай лабараторыі прафесара Томаса Ханта Моргана, сусветна вядомага генетыка, стваральніка храмасомнай тэорыі спадчыннасці, заснавальніка генетычных асноў тэорыі натуральнага адбору, лаўрэата Нобелеўскай прэміі.

Пачынаючы з 1931 да 1936 года А.Р. Жэбрак – прафесар Маскоўскай акадэміі земляробства і адначасова з 1934 года – загадчык кафедры генетыкі і цыталогіі сельскагаспадарчай акадэмі імя Ціміразева.

У 1940 годзе землякі-беларусы абралі яго акадэмікам Акадэміі навук рэспублікі, адразу пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны – прэзідэнтам Акадэміі навук. Жэбрак меў к таму часу 100 навуковых прац па агульнай генетыцы і генетыцы раслін. На ягоных грудзях ззялі заслужаныя ўзнагароды – Ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі і Знак Пашаны. У 1945 годзе ў саставе дэлегацыі Беларусі ён падпісаў у Сан-Францыска Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, а ў наступным годзе выконваў важныя даручэнні ў Балгарыі і Польшчы. Аднак навука, і ў прыватнасці генетыка,заставаліся для Антона Раманавіча галоўнай справай.

Асноўныя навуковыя працы акадэміка прысвечаны гібрыдызацыі, паліплодыі і селекцыі пераважна пшаніцы і грэчкі.

Жыццё Антона Раманавіча Жэбрака абарвалася пасля чарговага інфаркту 20 мая 1965 года ў Маскве на 64 годзе жыцця.

У гонар ушанавання памяці акадэміка ў Зэльве адну з вуліц пасёлка назвалі імем А.Р. Жэбрака і ў яго на радзіме, в.Збляны, устаноўлены Памятны знак.

На магіле А.Р. Жэбрака –каменная стэла, на якой высечаны мудры лацінскі выраз: "Пакуль дыхаю – спадзяюся…" У ім - увесь Антон Раманавіч Жэбрак. А пшанічны колас. Таксама высечаны ў камені, сведчыць аб галоўным – бессмяроцці Хлеба і Чалавека. Чалавека, які аддаў за хлеб усяго сябе.

**Міхаіл Іванавіч Іоська (1926- 1989)** нарадзіўся 5 сакавіка 1929 года ў сялянскай сям'і . Вучыўся ў Барадзіцкай пачатковай школе, а потым у Зэльвенскай сярэдняй школе. Са школы цікавіўся кнігай, шмат чытаў, асабліва любіў гістарчныя творы . А калі скончыў школу, паехаў у Мінск і паступіў на філасоўскі факультэт Белдзяржуніверсітэта.

У сярэдзіне 1950-х гадоў трапляе ва Узбекістан, у горад Самарканд, дзе працаваў у абласной газеце "Ленінскі шлях". У Самаркандзе Міхаіл Іоська адпрацаваў 6 гадоў.

Пасля вяртання на радзіму, у 1963 годзе Міхаіл Іванавіч паступае вучыцца ў аспірантуру пры кафедры гісторыі філасофіі і логікі Белдзяржуніверсітэта. Пасля аспірантуры працуе на гэтай кафедры, абараняе кандыдацкую дысертацыю, выкладае ў Белдзяржуніверсітэце гісторыю замежнай філасофіі. А яшчэ рэдагуе газету "Беларускі універсітэт".

У 1984 – 1986 гадах Міхаіл Іоська працаваў у Мінскім інстытуце культуры.

У 1976 годзе Міхаіл Іоська выдаў сваю кнігу на рускай мове "Николай Судиловский - Русель". Праз год, у 1977 годзе, у Мінску выдаецца яго чарговае даследаванне – кніга "К. Маркс, Ф.Энгельс и революционная Белоруссия". Перавыданне гэтай кнігі пабачыла свет у 1985 годзе. Аўтар 62 навуковых работ.

Гісторыка і філосафа М.Іоська з Бародзіч не стала 2 лютага 1986 года. Пахаваны ён у Мінску.

**Лабовіч Георгій Сцяпанавіч** нарадзіўся ў в.Навасёлкі . У 1957 годзе скончыў Навагрудскае педвучылішча, а ў 1975 – Магілёўскі педагагічны інстытут. З 1944 года працаваў настаўнікам Івашкавіцкай пачатковай школы, затым настаўнікам геаграфіі Каралінскай сярэдняй школы. Званне "Заслужаны настаўнік БССР" прысвоена ў 1968 г. Памёр у 2000 годзе.

**Павел Ільіч Жданаў (1903- 1986)** нарадзіўся ў 1903 г. у г. Слоніме Гродзенскай губерні ў сям'і селяніна.

Працоўную дзейнасць пачаў у 1919 г. рабочым, працаваў сакратаром былога Зембінскага райкома камсамола Мінскай вобласці. З 1925 па 1938 год П.І. Жданаў – у радах Чырвонай арміі. У 1930 г. закончыў Мінскае ваеннае пяхотнае вучылішча. Служыў палітработнікам у вайсковых падраздзяленях. З 1938 па 1941 год працаваў загадчыкам Бабруйскага гарфінаддзела, загадчыкам аддзела народнай асветы, інструктарам Магілёўскага абкома КП(б) Б.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Жданаў знаходзіўся на Заходнім і бранскім франтах на пасадзе ваеннага камісара часцей, у 1942 закончыў курсы "Выстрел", а з лютага 1943 г. камандзір 310-га стралковага палка 13-й арміі. Удзельнічаў у бітве на Курскай дузе, вызваленні Арлоўскай вобласці. Вызначыўся пры фарсіраванні Дзясны, якую воіны яго палка пераадолелі на двух участках, і Дняпро на поўнач ад Кіева.

За гераізм і мужнасць , праяўленыя пры фарсіраванні Дняпра 16.10.1943 г. яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

За баявыя заслугі ў час Вялікай Айчыннай вайны падпалкоўнік Павел Ільіч Жданаў узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Суворава III ступені, Айчыннай вайныI ступені, Чырвонай Зоркі, многімі медалямі, граматамі Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета БССР.

Пасля дэмабілізацыі з 1945 па май 1957 гг працаваў брыгадзірам саўгаса і на розных гаспадарчых работах у Горкаўскай вобласці, затым старшынёй калгаса імя Дзяржынскага Навагрудскага і імя Якуба Коласа Зэльвенскага раёнаў. Памёр у 1986 годзе.

На доме, у г.п. Зэльва, дзе пражываў Герой Савецкага Саюза, Пётр Ільіч Жданаў знаходзіцца імянная дошка.

**Сяўко Баляслаў Іванавіч (1940- 2002)** нарадзіўся 15 мая 1940 г. у в. Міжэрычы. Беларускі акцёр. Заслужаны артыст БССР (1976). У 1965 годзе скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. З гэтага года працаваў у Беларускім тэатры імя Я.Коласа. Выканаўца рознапланавых роляў у п'есах "Таблетку пад язык", "Трыбунал", "Зацюканы апостал" А. Макаёнка; "Апошняя інстанцыя" М. Матукоўскага; "Слуга двух паноў" К. Гальдоні; "Правінцыяльныя анекдоты", "Развітанне ў чэрвені" А.вампілава. У 1969 г. арганізаваў Віцебскі народны тэатр пантамімы "МІм". Здымаўся ў кінафільмах "Малады дубок", "Дзяржаўная граніца"

Памёр у 2002 годзе.

**Сідар Сяргей Іванавіч (1937 – 1998 гг.)** нарадзіўся ў 1937 г. у в. Янаўшчына. У 1991 годзе атрымаў званне доктара педагагічных навук, а ў 1992 – прафесара. У 1964 годзе скончыў БДУ. Працаваў настаўнікам і дырэктарам школы на Гродзеншчыне, старшым выкладчыкам Магілёўскага педінстытута. З 1974 г. дацэнт кафедры эканамічнай геаграфіі Беларусі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Аўтар навуковых прац па сацыяльна-эканамічнай геаграфіі Беларусі, дапаможнікаў для ВНУ, падручніка "Геаграфія Беларусі" для сярэдняй школы.

**Малочка Мікалай Пятровіч** (**1919- 1988 гг**.) нарадзіўся 12 снежня 1919 года ў в. Чырвонае Сяло. Дзяржаўны дзеяч. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў загадчыкам аддзела Зэльвенскага райкома КП (б) Б, сакратаром Гродзенскага абкома КПБ, з 1961 г. – старшыня Гродзенскага аблвыканкама., міністрам гандлю Беларусі (1972-1984 гг). Узнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Аўтар кнігі ўспамінаў "Аб пражытым і перажытым", якая выйшла ў 1989 годзе.